А. І. ДУЖЫ, А. В. АНУФРЫЕЎ, А. В. ДАМАРАДАЎ

# УЛАДЗІМІР ГЕОРГІЕВІЧ ЧЭШЫК (1929-2001)

Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

Чатырнаццатага студзеня 2007 г. споўнілася 78 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Георгіевіча Чэшыка — славутага хірурга, аднаго з найбольш таленавітых арганізатараў аховы здароўя Беларусі, выдатнага спецыяліста ў галіне таракальнай хірургіі, стваральніка першага ў БССР лёгачнага хірургічнага цэнтра.

У Г. Чэшык нарадзіўся 14 студзеня 1929 г. ў в. Рэчкі Вілейскага раёна Мінскай вобласці. Вось што расказвае пра сям'ю і асабістыя якасці У. Г. Чэшыка яго стрыечны пляменнік, асістэнт кафедры анатоміі чалавека з курсамі аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта І. А. Чэшык: "Бацька Уладзіміра Георгіевіча быў праваслаўным святаром спачатку ў Лідзе, потым у Вільні, меў свой прыход. Маці займалася хатняй гаспадаркай. Жонка, Людміла Уладзіміраўна, працавала гінеколагам, загадчыкам гінекалагічнага аддзялення лякарні хуткай медыцынскай дапамогі г. Гомеля. Родны брат, Святаслаў Георгіевіч, таксама прысвяціў сваё жыццё медыцыне: доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны ўрач Расійскай Федэрацыі, кіраўнік клінічнага аддзела навукова-даследчага Інстытута вірусалогіі Расійскай Акадэміі медыцынскіх навук, галоўны дзіцячы інфекцыяніст дэпартамента аховы здароўя г. Масквы.

Уладзімір Георгіевіч бачыў і ў сыне Сяргеі свайго паслядоўніка, але той знайшоў іншае прызванне — неба: скончыў Тамбоўскае вышэйшае авіяцыйнае ваеннае вучылішча, потым Ваенна-паветраную акадэмію імя Ю. Гагарына, зараз — падпалкоўнік Ваенна-паветраных сіл Расійскай Федэрацыі".

З жніўня 1951 г. пасля паспяховага заканчэння лячэбнага факультэта Мінскага медыцынскага інстытута Уладзімір Георгіевіч пачынае свой працоўны шлях у якасці загадчыка ўчастковай лякарні ў в. Тульгавічы Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. ён марыў пра вялікую хірургію, а яго сустрэла невялічкая ўстанова ўсяго на 15 ложкаў. Два гады працаваў У. Г. Чэшык на гэтай пасадзе. У 1953 г. ён быў пераведзены на працу ардынатарам хірургічнага аддзялення Палескай абласной лякарні, якая знаходзілася ў Мазыры. Э. Я. Кенісберг, кандыдат медыцынскіх навук, галоўны хірург Палескай вобласці і загадчык хірургічнага аддзялення Палескай абласной лякарні, быў непасрэдным кіраўніком маладога ардынатара. У гэтым жа годзе Уладзімір Георгіевіч накіраваны на пасаду загадчыка хірургічнага аддзялення Камарынскай раённай лякарні Палескай вобласці, а ў сакавіку 1954 г. становіцца галоўным урачом гэтай лякарні. У студзені 1955 г. залічаны на пасаду галоўнага ўрача Акцябрскай раённай лякарні, дзе адначасова загадваў хірургічным аддзяленнем. Настойліва і ўпарта займаўся траўматалогіяй, хірургіяй брушной поласці. У жніўні 1955 г. У. Г. Чэшык быў пераведзены ў Гомельскую абласную (1-ю Савецкую) лякарню ардынатарам хірургічнага аддзялення. Яго плённая праца ў хірургічнай галіне, да якой ён ставіўся з вялікім энтузіязмам, садзейнічала таму, што за кароткі час У. Г. Чэшык становіцца адным з вядучых хірургаў Гомельскай вобласці.

У лютым 1958 г. У. Г. Чэшык узначаліў 2-е хірургічнае аддзяленне Гомельскай 1-й абласной лякарні і асвоіў шэраг новых найскладанейшых аперацый: рэзекцыю лёгкага, пульманэктамію, дэкартыкацыю лёгкага, пластыку стрававода. У 1959 г. упершыню ў Гомельскай вобласці без папярэдняй практыкі (!) Уладзімір Георгіевіч паспяхова правёў аперацыю на органах груднай поласці. Гэта была лабэктамія з прычыны лёгачнага крывацёку. Яна дала пачатак усёй далейшай практычнай і хірургічнай дзейнасці У. Г. Чэшыка.

Усё новыя аперацыі выконваліся пад эндатрахеальным наркозам. З 1960 г. У. Г. Чэшык пачаў праводзіць пластыку стрававода і эндаскапічнае выдаленне іншародных целаў стрававода і дыхнікаў (бронхов).

Аб тым, што гэта быў хірург як кажуць "ад Бога", можна даведацца са слоў галоўнага ўрача Гомельскага абласнога шпіталю інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны Л. І. Друяна: "Мой бацька быў хірургам і яны разам з Уладзімірам Георгіевічам працавалі. Тата заўсёды адзначаў яго прафесійнае наватарства, неаднаразова захапляўся ім як смелым хірургам. Аднойчы, падчас скпаданай аперацыі, у хворай з неспрыяльным прагнозам здарыўся разрыў буйной артэрыі ў груднай поласці. У. Г. Чэшык імгненна, у 2—3 прыёмы, разрэзаў грудную камору (клетку), прыціснуў крыватачывую судзіну (сосуд) ручнікам і такім чынам выратаваў жанчыну ад смерці."

У 1962 г. для ўзмацнення барацьбы супраць сухотаў і арганізацыі службы па іх хірургічнаму лячэнню Уладзімір Георгіевіч Чэшык быў накіраваны ў Гомельскую абласную сухотную лякарню, дзе стварыў і ўзначаліў упершыню ў БССР лёгачны хірургічны цэнтр на 75 ложкаў З гэтага моманту аказанне дапамогі па ўсёй паталогіі лёгкіх і іншых органаў груднай поласці канцэнтравалася разам у межах адной установы. Гэта садзейнічала якаснаму сартаванню хворых, паспяховаму іх лячэнню і дыспансерызацыі. Нарэшце мара доктара пра вялікую хірургію цалкам збылася. Пачалася шырокая лячэбная, кансультатыўная, арганізацыйная праца па ўкараненні ў практыку аперацыйных умяшанняў на органах груднай поласці пры любой паталогіі, у тым ліку пры анкалагічных захворваннях. Доўгі час (да 2003 г.) лёгачны хірургічны цэнтр з'яўляўся галаўной установай у вобласці па аказанні кваліфікаванай медыцынскай дапамогі хворым на карбунку (рак) лёгкага.

Далейшы працоўны шлях У. Г. Чэшыка непарыўна звязаны з Гомельскай абласной сухотнай лякарняй.

Уладзімір Георгіевіч адзін з першых у СССР і першы ў БССР пачаў праводзіць і ўкараняць у новым цэнтры рэканструктыўна-аднаўленчыя аперацыі на дыхніцы (трахее) і дыхніках.

У 1963 г. ён выканаў рэарацыю атэлектазаванага лёгкага праз месяц і праз 4 гады пасля траўмы. Функцыя лёгкага ў абодвух выпадках аднавілася. Для памяншэння парушэнняў газаабмену падчас аперацый

У.Г. Чэшык у 1967 г. пачынае спыняць кровазварот праз невентыліруемае лёгкае перацісканнем лёгачнай артэрыі (фізіялагічная пульманэктамія); праводзіць аперацыі хворым з дабраякаснымі пухлінамі дыхніцы, сярод якіх былі і рэдкія формы [4, 6].

З канца 60-х — пачатку 70-х гг. Уладзімір Георгіевіч пачаў праводзіць аперацыі на вілавіцы (тимусе) пры яе пухлінах у хворых на міастэнію, а таксама пластычныя аперацыі на лейкападобнай (воронковидной) груднай каморы.

"За час працы на пасадзе загадчыка лёгачнага хірургічнага цэнтра, — расказвае намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Гомельскай абласной сухотнай клінічнай лякарні В. А. Мацукевіч, — Уладзімір Георгіевіч прадэманстраваў сябе як высокакваліфікаваны спецыяліст, выдатны арганізатар і кіраўнік калектыву. Дзякуючы безупыннай працы і магутнай энергіі ім былі выхаваны высокакваліфікаваныя кадры ўрачоў, сясцёр і іншых медыцынскіх работнікаў. У сваіх вучнях — сапраўдных урачах-спецыялістах — ён бачыў уласнае адлюстраванне, вартую сабе замену.

Аперацыі на лёгкіх патрабавалі ведання не толькі таракальнай хірургіі, але й сумежных спецыялізацый, напрыклад судзіннай (сосудистой) хірургіі. Уладзімір Георгіевіч выступаў за тое, каб дактары ведалі асновы сумежных спецыялізацый, таму яго любімым выказваннем было: "Мне не патрэбны дактары па леваму вуху і па праваму вуху!" Таксама практыкаваў часовае перавядзенне ўрачоў з судзіннага аддзялення ў таракальнае і наадварот".

У 1965 г. Гомельская абласная сухотная лякарня і абласны супрацьсухотны дыспансэр былі рэарганізаваны ў абласны супрацьсухотны дыспансэр.

Сусветная вядомасць і павага прыйшлі да Уладзіміра Георгіевіча ў 1968 г.: 23 красавіка 1968 г. упершыню ў СССР ён выканаў цыркулярную рэзекцыю раздвою дыхніцы (бифуркации трахеи) з захаваннем абодвух функцыянуючых лёгкіх. Аперацыя праводзілася па прычыне злаякаснай адэномы дыхніцы з пераходам на карыну і правы галоўны дыхнік у хворай 56 гадоў, якой пасля высячэння раздвойнага сегменту даўжынёю 4,5 см, дапоўненага прысценачным выдаленнем верхняй полай жылы (вены), удалося аднавіць праходнасць дыхацельных шляхоў за кошт стварэння Т-падобнага злучэння, прычым забеспячэнне газаабмену падчас аперацыі дасягалася вентыляцыяй левага лёгкага праз трубку сістэмы шунт-дыхання (мал. 1). Аб удала праведзенай аперацыі ён абвясціў на пасяджэнні хірургічнага таварыства імя Пірагова 13 лістапада 1968 г. [5].

З 4 лістапада 1968 г. У. Г. Чэшык прызначаны на пасаду галоўнага ўрача Гомельскага абласнога супрацьсухотнага дыспансэра, адначасова выконваў функцыі загадчыка хірургічнага аддзялення і актыўна працягваў апераваць.

З характэрнай для яго энергіяй і мэтанакіраванасцю пачаў праводзіць вялікую работу па зніжэнню захворвання на сухоты насельніцтва Гомельшчыны. За час дзейнасці на пасадзе галоўнага ўрача У Г. Чэшык дасягнуў значных поспехаў у барацьбе з сухотамі. Так, захворванне знізілася з 121,0 на 100 тыс. насельніцтва У 1970 г. да 34,7 у 1990 г., хваравітасць ці распаўсюджанасць захворвання — з 591,0 на 100 тыс. да 173,9




Мал. 1. Схема цыркулярнай рэзекцыі раздвою дыхніцы з захаваннем абодвух функцыянуючых лёгкіх:
1 — лінія перасячэння дыхніцы і дыхнікаў; 2 — сшыванне прысярэдніх сценак дыхнікаў; 3 — сшыванне дыхніцы з дыхнікамі; 4 — злучэнне дыхніцы з абодвума галоўнымі дыхнікамі

адпаведна. Смяротнасць паменшылася з 20,5 на 100 тыс. у 1970 г. да 4,4 на 100 тыс. у 1990 г.

Намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Гомельскага абласнога шпіталю інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны В. І. Хадановіч расказвае: "У Г. Чэшык быў выдатным спецыялістам, стварыў лёгачную хірургію вобласці. За арганізацыйныя ўласцівасці Упраўленне аховы здароўя накіравала яго на пасаду галоўнага ўрача і не памылілася. Да з'яўлення У. Г. Чэшыка ў фтызіятрычнай службе праблемай сухотаў у вобласці займаліся, але магчымасці былі абмежаваныя. "н быў першаадкрывальнікам хірургічнага лячэння сухотаў у Гомельскай вобласці!"

На базе сухотнай лякарні праводзілася вучоба ўрачоў на працоўным месцы, а таксама выязныя цыклы ўдасканалення ўрачоў кафедрамі Цэнтральнага інстытута Ордэна Леніна ўдасканалення ўрачоў Міністэрства аховы здароўя СССР, Беларускім дзяржаўным інстытутам удасканалення ўрачоў. Па запрашэнні У. Г. Чэшыка навукоўцы з Ленінградскага інстытута пульманалогіі некалькі разоў чыталі цыклы лекцый у Гомельскай сухотнай лякарні.

Дзякуючы У. Г. Чэшыку на базе лёгачнага хірургічнага цэнтра ў 1972 г. было створана аддзяленне судзіннай хірургіі на 40 ложкаў. У гэтым жа годзе Гомельская абласная спецыялізаваная клінічная лякарня пачынае аказваць хірургічную дапамогу хворым на лёгачныя сухоты з Брэсцкай вобласці і пацыентам, што пакутуюць на судзінныя захворвані, з Магілёўскай вобласці.

У 1975 г. Гомельскі абласны супрацьсухотны дыспансэр зноў быў перайменаваны ў Гомельскую абласную сухотную лякарню.

17 жніўня 1979 г. Гомельская абласная лякарня была ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Успамінае загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Гомельскай абласной сухотнай клінічнай ля-

карні І. І. Грамко: "Мне пашчасціла працаваць з Уладзімірам Георгіевічам на працягу амаль 27 гадоў. На выклікі па санавіяцыі ён выязджаў заўсёды са сваімі анестэзіёлагамі, бо ведаў, што таракальныя аперацыі, аперацыі на судзінах і выдаленне іншародных целаў з дыхнікаў патрабавалі асаблівага анестэзіялагічнага забеспячэння, якім не валодалі на раёнах.

"н актыўна займаўся развіццём донарства, у прыватнасці аўтатрансфузіялогіяй: у хворых з рэдкай групаю крыві некалькі разоў перад запланаванай аперацыяй рабілі яе забор, а падчас аперацыйнага ўмяшання хвораму вярталі яго ўласную кроў".

Уладзімір Георгіевіч арганізаваў выезды хірургаў па экстраннай дапамозе ў раённыя лякарні па лініі санавіяцыі. Працаваў бортхірургам на працягу шэрагу гадоў.

У. Г. Чэшык з'яўляўся заснавальнікам пульманалагічнай службы Гомельскай вобласці. Дзякуючы яму ў канцы 1978 г. на базе Гомельскай абласной сухотнай лякарні адбылося адкрыццё пульманалагічнага аддзялення як самастойнага падраздзялення для лячэння хворых з неспецыфічнымі захворваннямі органаў дыхання, а ў 1983 г. побач з 1-м ствараецца 2-е пульманалагічнае аддзяленне.

1 жніўня 1989 г. на базе цэнтра Уладзімір Георгіевіч адкрывае аддзяленне кардыёхірургіі. Упершыню на Гомельшчыне ў ім пачалі ўсталёўваць кардыёстымулятары.

У 1991 г., на падставе дамовы аб узаемным супрацоўніцтве паміж Гомельскім дзяржаўным медыцынскім інстытутам і сухотнай лякарняй, апошняй быў нададзены статус клінічнай. Між тым Уладзімір Георгіевіч заўсёды бачыў сваю лякарню як шматпрофільную хірургічную клініку. 1 кастрычніка 1991 г. з'явілася новая назва: Гомельская абласная спецыялізаваная клінічная лякарня".

З 1993 г. у сухотнай лякарні функцыянуе алергалагічнае аддзяленне для аказання кваліфікаванай дапамогі даросламу насельніцтву, што пакутуе на алергічныя захворванні.

На жаль, у 1998 г. аддзяленне кардыёхірургіі было пераведзена на базу Гомельскага абласнога кардыялагічнага дыспансэра, а на яго месцы ўзнікла 3-е пульманалагічнае аддзяленне.

На пасадзе галоўнага ўрача Уладзімір Георгіевіч знаходзіўся да 1995 г., а з 1995 па 2000 гг. быў намеснікам галоўнага ўрача Гомельскай абласной спецыялізаванай клінічнай лякарні. Свой працоўны шлях скончыў 21-га снежня 2000 г.

Высока ацэньвае У Г. Чэшыка доктар медыцынскіх навук, загадчык кафедры артапедыі, траўматалогіі і ваенна-палявой хірургіі М. М. Дзятлаў: "Уладзімір Георгіевіч быў эрудытам і хірургам шырокага дыяпазону: валодаў адмысловай тэхнікай аперацый, выконваў нейрахірургічныя аперацыі на галаўным мозгу, займаўся траўматалогіяй (выконваў рэзекцыю целаў грудных хрыбетак праз транстаракальны доступ, рабіў астэасінтэз сцягновай косці). У той жа час выконваў аперацыі пры спалучаных пашкоджаннях (нажавое раненне лёгкіх, дыяфрагмы, печані, кішэчніку). Добра ведаў фармакалогію, што практычна не ўласціва хірургам. Аналітычнасць яго розуму была моцнай.

Значнасць Уладзіміра Георгіевіча Чэшыка як нацыянальнага героя Беларусі выходзіць за межы медыцынскай вартасці. Асаблівасці яго творчага і прафесійнага жыцця вельмі павучальныя і каштоўныя для спецыялістаў любога ўзросту, асабліва для маладых. Але не кожнаму маладому чалавеку пад сілу паўтарыць жыццё такога хірурга ў медыцыне, таму шта ён — волат! Для гэтага трэба мець прыродныя дадзеныя і неймаверную сілу духа".

У цэнтры таракальнай хірургіі пад кіраўніцтвам Упадзіміра Георгіевіча шырока праводзілася навукова-даследчая праца. Асабіста У. Г. Чэшык з'яўляецца аўтарам 97 навуковых публікацый. У галіне ангіялогіі вывучаў паталогію сонных артэрый, артэрый ныркі. У фтызіятрыі — метады хірургічнага лячэння (кавернапластыка, арганазахоўваючыя аперацыі, калапсатэрапія), сучасныя метады дыягностыкі сухотаў, вывучаў эфектыўнасць і магчымасці бактэрыяскапічных метадаў выяўлення ўзбуджальнікаў сухотаў і адзначаў, што люмінісцэнтная мікраскапія, у адрозненні ад светлавой мікраскапіі, дазваляе значна часцей і з вялікай дакладнасцю выяўляць мікабактэрыі сухотаў, у тым ліку кокападобныя і L-формы [1, 2].

Займаўся праблемамі вынікаў Чарнобыльскай катастрофы (вывучаў змяненне мікабактэрый сухотаў пад уздзеяннем радыяцыі і захворванне на сухоты ў раёнах, забруджаных радыёнуклідамі). Даследаваннямі ён паказаў, што дрэннае становішча, якое склалася ў раёнах з павялічаным узроўнем радыяцыі, прыводзіць да росту персістэнтных форм узбуджальніка сухотаў, у тым ліку L-трансфармаваных. Аналіз лекавай устойлівасці мікабактэрый, выдзеленых у хворых, якія жывуць у тых жа раёнах, дапамог высветліць, што першасная лекавая ўстойлівасць і асабліва колькасць полірэзістэнтных штамаў ва ўпершыню выяўленых хворых прыкметна ўзрасла [1, 3].

Уладзімір Георгіевіч рэгулярна выступаў з дакладамі і дэманстрацыямі хворых на ўрачэбных з'ездах і пасяджэннях навуковых суполак, удзельнічаў ва Усесаюзных з'ездах хірургаў, у працы Сусветнага кангрэса трансфузіёлагаў і Міжнароднага кангрэса хірургаў. У траўні 1962 г. Уладзімір Георгіевіч прымаў удзел ва "Усесаюзнай нарадзе па пытаннях хірургічнага лячэння лёгачных сухотаў", якая праходзіла ў Маскве.



Мал. 2. Адкрыццё помніка У. Г. Чэшыку 4 лістапада 2005 года. Урачыстае ўскладанне кветак




Мал. 3. Помнік Уладзіміру Георгіевічу Чэшыку

"Асаблівы прыярытэт на міжнародных канферэнцыях у Маскве, Ленінградзе і іншых гарадах, — працягвае В. А. Мацукевіч, — ён аддаваў дакладам па таракальнай хірургіі, судзіннай хірургіі, сухотам, карбунцы лёгкага. Даказваў, што паслясухотныя шнары (рубцы) — гэта адзін з фактараў развіцця карбунцы лёгкага, распавядаў пра асабісты вопыт па пластыцы дыхніцы і дыхнікаў, а таксама страваводa страўнікавай трубкай.

Водпускі У. Г. Чэшык траціў на наведванне вядомых клінік (у Кіеве, Ленінградзе, Маскве і інш.), спасціжэнне і далейшае ўкараненне новых тэхналогій у дыягностыку і лячэнне".

У. Г. Чэшык заўсёды ішоў у нагу з часам, і таму цэнтр грудной хірургіі быў абсталяваны па апошняму слову тэхнікі. Тут з'явіўся першы ў вобласці апарат штучнай ныркі, ангіёграф, кампутарны тамограф, апарат плазмаферэзу, баратэрапіі, аддзяленне лазернай тэрапіі, радыёізатопная лабараторыя. Будучы на пасадзе галоўнага ўрача, Уладзімір Георгіевіч заўсёды клапаціўся аб добрым сацыяльным забеспячэнні сваіх супрацоўнікаў. Так, пад яго непасрэдным кіраўніцтвам была пабудавана сталовая, а за межамі бальніцы — 3 інтэрната для супрацоўнікаў. Былі ўзведзены 2 новых лячэбных корпуса — фтызіятрычны і пульманалагічны, а таксама рэстаўраваны старыя.

Працягвае І. А. Чэшык: "Заслугі У. Г. Чэшыку — развіцці сухотнай лякарні, стварэнні спецыялізаванай фтызіятрычнай службы ўвогуле (улічваючы фтызіятрычныя кабінеты ўсіх узроўняў (раённых, абласных), выязных фтызіятрычных брыгад. Таксама ў стварэнні інфраструктуры лякарні, жыллёва-бытавых умоў (ніводная лякарня ў Гомелі і вобласці не мела і не мае такой жыллёвай уладкаванасці, як абласная сухотная лякарня)".

Разам з практычнай працай У. Г. Чэшык займаўся грамадска-палітычнай дзейнасцю, быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР з 1985 па 1991 гг.

У 1963 г. Уладзіміру Георгіевічу прысвоена кваліфікацыя урача-таракальнага хірурга 1-й катэгорыі, а ў 1967 г. — вышэйшай.

У 1968 г. за вялікія заслугі ў галіне аховы здароўя яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны ўрач БССР". У. Г. Чэшык узнагароджаны ордэнам Леніна (1986), ордэнам "Знак Пашаны", медалямі "За сумленную працу", "Ветэран працы" (1987).

Працоўны шлях Уладзіміра Георгіевіча адзначаны 32 афіцыйнымі падзякамі за сумленнае выкананне службовых абавязкаў, вялікі асабісты ўклад у арганізацыю медыцынскай дапамогі насельніцтву, умелае кіраўніцтва і актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні раённых і абласных спаборніцтваў санітарных дружын, адна з іх — за адкрыццё і рацыяналізатарскую прапанову.

Вядомасць У. Г. Чэшыка ахоплівала не толькі тэрыторыю нашай краіны, але пашыралася далёка за яе межы.

Анатоль Дамарадаў, хірург абласной лякарні, у былым — анестэзіёлаг, які ў 1959 г. упершыню ў Гомельскай вобласці даў эндатрахеальны наркоз хвораму, якога апераваў У. Г. Чэшык, успамінае: "Уладзімір Георгіевіч быў чалавекам жарсткаватым, справядлівым, заўсёды ўважліва прыслухоўваўся да меркаванняў суразмоўцы, быў дабразычлівым, а галоўнае — Чалавекам з вялікай літары, які самааддана займаўся любімай справай".

"Кожную раніцу, незалежна ад святаў, выхадных, знаходзячыся ўжо на пенсіі і маючы кволае здароўе, Уладзімір Георгіевіч роўна а 6-й гадзіне сядаў у машыну, што прыходзіла і дастаўляла яго ў родную лякарню, дзе ён праводзіў ранішні агляд хворых у рэанімацыйным аддзяленні, размаўляў з пацыентамі, старанна вывучаў гісторыі хваробаў, знаёміўся з вынікамі аналізаў і даваў персаналу неабходныя парады", — адзначаў стрыечны пляменнік У. Г. Чэшыка.

8 красавіка 2001 г. гэтага таленавітага чалавека не стала. Але ён назаўсёды застаўся ў памяці і сэрцах яго паслядоўнікаў.

Супрацоўнікі Гомельскай абласной спецыялізаванай клінічнай лякарні на чале з галоўным урачом І. Л. Машуковым у памяць пра славутага калегу 4 лістапада 2005 г. урачыста адкрылі на тэрыторыі лякарні помнік У. Г. Чэшыку (архітэктар — Вячаслаў Карпавіч Далгоў) (мал. 2, 3). Часам здаецца, што з пастаменту доктар пазірае на лякарню і на зялёныя хвоі, якія лагодна гайдаюцца на вятры, і быццам сваім позіркам натхняе нас на новыя пачынанні ў практычнай дзейнасці.

### Выкарыстаная літаратура

1. *Великевич Г. П., Чешик В.Г., Шевченко Н. Н. //материалы пленума республиканского научного общества фтизиаторов 24—25 марта 1997 г — Гомель, 1997.— С. 213—215.*
2. *Волков А. И., Ильюшкин Н. А., Чешик В. Г. //Там же — С. 198.*
3. *Ильюшкин Н. А., Чешик В. Г., Бернштейн Е. Д., Бутько С. В. //Тамже— С. 177.*
4. *Перельман М. И. Хирургия трахеи.— М., 1972.*
5. *Чешик В. Г. //Вестн. хируpaии— 1969.— №3.— С. 149— 150.*
6. *Чешик В. Г. //Хирургия.— 1968.— № 1.— С. 122.*